

І ВУЧЫЦЦА, І ВУЧЫЦЬ ІНШЫХ У 60+

7

ЗЯМЛЮ ЧАКАЕ КЛІМАТЫЧНЫ АПАКАЛІПСІС?

11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 ВЕРАСНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 181 (29048)

## ЛІЧБА ДНЯ

**48 %**

*плошчаў бульбяных палетказ убралі на сённяшні дзень сельгасарганізацыі краіны. Гэта больш чым 13,5 тысячы гектараў. Усяго сёлета пад бульбу адведзена 27,7 тысячы гектараў. Па даных на 23 верасня, накапана 430,8 тысячы тон бульбы. У сярэднім з 1 гектара сёлета збіраюць 325,2 цэнтнера бульбы, гэта на 35,9 цэнтнера больш за леташні паказчык. Лідарам ва ўборцы другога хлеба з'яўляецца Віцебская вобласць, там на сённяшні дзень убрана 60,9 % плошчаў бульбы. Таксама ў гэтым рэгіёне самы высокі паказчык ураджайнасці — 404,5 ц/га. Крыху менш — 395,3 ц/га — збіраюць у Магілёўскай вобласці. Працягваецца ў гаспадарках краіны і ўборка цукровых буракоў.*



# ХРУСТКАЯ РАБОТА



Фота БелТА.

Гаворачы пра ўборку ўраджаю па краіне, нельга не згадаць капусту — любімую вітамінную агародніну ў нашым рацыёне. Некаторыя гаспадаркі аддаюць пад гэту папулярную культуру вялікія плошчы. Напрыклад, у сельгаспрадпрыемстве «Фірма «Кадзіна» Магілёўскага раёна пад яе адведзена 40 гектараў. Так што паляводу Аксане ЦЫМЛЯКОВАЙ *(на фота)* і яе калегам хрусткай работы гэтай восенню хопіць.

## КОРАТКА

• У Беларусі распрацоўваецца праграма па пераходзе ўсяго грамадскага транспарту ў буйных гарадах на электрычную цягу.

• Клоўнатэрапію пачнуць прымяняць ва ўстановах аховы здароўя Мінскай, Гомельскай, Гродзенскай і Віцебскай абласцей.



• «Белтэлекам» запускае ўласны тэлеканал «Яснае TV» на беларускай і рускай мовах на базе тэлеканала «Мінск TV».

• Серыял «Чарнобыль», зняты па падзеях 1986 года на Чарнобыльскай АЭС, атрымаў тры ўзнагароды на цырымоніі «Эмі» ў Лос-Анджэлесе.

Цікавы праект

## ХТО Ў ХАЦЕ ГАСПАДАР

Секлі дровы, майстравалі лаўкі і каталіся на лыжах па траве

СТАР. 4



Пераможца абласнога этапу праекта «Уладар сяла» сям'я Мячкоўскіх.

Фота БелТА.

Разумныя грошы

## Бабулі не хапае на патэльню,

### або Пазычаць трэба з розумам

Маёй маці заўсёды ўсё цікава. Яна па-дзіцячы жыва дзівіцца ўсім тэхнічным навінкам, новым спажывецкім таварам, наогул усім новым. Таму яе заўсёды запрашаюць на розныя прэзентацыі, паказы, чаяванні і іншыя продажы розная патрэбнага (або непатрэбнага) дабра. З любога такога паходу яна нясе дадому патэльні, падушкі і нават тэпцікі. Ну не можа адмовіць мая дарагая матуля практычна нікому. Бо грошы не галоўнае.

Але ўжо год як яе не клічуць на такія тэматычныя вячоркі. А ўсё таму, што маці ўжо больш за 80 гадоў. Яна ім стала нецікавая, таму што на буйную куплю трэба браць крэдыт...

СТАР. 7

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» — і выйграй карысны прыз!

Завяршаецца падпіска на IV квартал 2019 года

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – БУДЗЕ ЦІКАВА!